**СТАНІСЛАЎ РУДОВІЧ**
ORCID: 0000–0002–6967–7699

# 1918 ГОД, ЯГО ПЕРАДУМОВЫ І НАСТУПСТВЫ Ў ТРАКТОЎЦЫ ШКОЛЬНЫХ ПАДРУЧНІКАЎ У БЕЛАРУСІ

DOI: 10.15290/sp.2018.26.02

**Abstrakt.** Artykuł pokazuje, jak w podręcznikach białoruskich do historii dla szkół średnich interpretowane są wydarzenia I wojny światowej i jej skutki dla świata, Europy, a szczególnie dla Białorusi. Przedstawia sprzeczności i niekonsekwencje w prezentacji procesów historycznych, co można tłumaczyć niezbyt jasną i pełną sprzeczności polityką pamięci, jaka jest realizowana w Republice Białoruś.

**Słowa kluczowe:** podręczniki do historii powszechnej, podręczniki do historii Białorusi, polityka pamięci, państwo białoruskie, tradycja sowiecka, historyczna legitymizacja niezależności Białorusi

**Анатацыя.** Артыкул паказвае, як у беларускіх падручніках па гісторыі для сярэдняй школы інтэрпрэтуюцца падзеі Першай сусветнай вайны і яе вынікі для свету, для Еўропы і асобна для Беларусі. Адзначаецца супярэчлівасць, непаслядоўнасць асвятлення адпаведных гістарычных працэсаў, што абумоўлена невыразнасцю і непаслядоўнасцю палітыкі памяці, якая праводзіцца ў Рэспубліцы Беларусь.

**Ключавыя словы:** падручнікі па сусветнай гісторыі, падручнікі па гісторыі Беларусі, палітыка памяці, беларуская дзяржаўнасць, савецкая традыцыя, гістарычная легітымізацыя незалежнасці Беларусі

**Abstract.** The article shows how the events of World War I and its consequences for the world, Europe and especially for Belarus, are interpreted in the Belarusian history textbooks for secondary schools. It discusses the contradictions and a lack of consequence in the way of presenting historical processes, which may be explained by an ambiguous and discrepant politics of the memory pursued in the Republic of Belarus.

**Key words:** general history textbooks, Belarusian history textbooks, politics of memory, Belarusian state, Soviet tradition, historical legitimization of Belarusian independence

Да 2008/2009 навучальнага года ў Рэспубліцы Беларусь дзейнічала двухузроўневая сістэма пабудовы вывучэння гісторыі ў сярэдняй школе: сусветная гісторыя і гісторыя Беларусі ад старажытнасці і да сучаснасці вывучаліся ў 5–9 класах на эмпірычным (падзейна-храналагіч-

ным узроўні), які прадугледжваў засваенне канкрэтных фактаў і іх першапачатковае абагульненне, а ў 10–11 (12) класах адбывалася паўторнае вывучэнне курсу гісторыі, але ўжо на праблемна-тэарэтычным узроўні, на якім павінны былі закладвацца асновы тэарэтычнага асэнсавання навучэнцамі заканамернасцяў і асаблівасцяў сусветна-гістарычнага працэсу. З 2008 г. ў Беларусі пачалося вяртанне да лінейнай сістэмы гістарычнай адукацыі, якая практыкавалася ў савецкай школе і якая мае на ўвазе аднаразовае вывучэнне сусветнай і айчыннай гісторыі ў іх храналагічнай паслядоўнасці[1].

Згодна з дзеючымі зараз праграмамі, першапачатковыя звесткі па гісторыі беларускія школьнікі атрымліваюць у 4-м класе – пры вывучэнні інтэграванага прадмета, які называецца так: "Чалавек і свет. Мая Радзіма – Беларусь". Да 2018 г. у якасці навучальнай кнігі па гэтым прадмеце выкарыстоўваўся аднайменны падручнік аўтарства кандыдата педагагічных навук С. В. Панова, кандыдата гістарычных навук С. В. Тарасава, метадыстаў І. А. Гімпель, В. Л. Белай і пісьменніка А. В. Вольскага[2]. Улетку 2018 г., да новага навучальнага года, у школы паступіў перапрацаваны варыянт дадзенай кнігі, аўтарамі якога значацца ўжо толькі С. В. Паноў і С. В. Тарасаў, і які мае статус не падручніка, а навучальнага дапаможніка[3].

Курс "Чалавек і свет. Мая Радзіма – Беларусь" утрымлівае агульныя звесткі пра прыроду і геаграфічнае становішча Беларусі, яе месца на палітычнай карце Усходняй Еўропы, дзяржаўны лад Рэспублікі Беларусь, у даступнай для чацвертакласнікаў форме распавядае пра асноўныя з'явы і постаці беларускай гісторыі. Сярод гістарычных сюжэтаў кнігі – паходжанне беларусаў, Полацкае княства, узнік-

[1] Паноў С. В. Гістарычная адукацыя ў Беларусі: вопыт рэфармавання і перспектывы ўдасканалення // Методология исследований истории Беларуси: проблемы, достижения, перспективы. Мат-лы Междунар. науч. конф-ции (Минск, 22–23 октября 2008 г.). Минск, 2009. С. 171–174; Корзюк А. А. Принципы построения содержания исторического образования в средней школе: общая характеристика и опыт реализации (1934–2008 гг.) // Методология и стратегии развития современного образования. Мат-лы Междунар. науч. конф-ции, посвященной 85-летию Национального института образования (Минск, 11 декабря 2014 г.). Минск, 2015. С. 515–524.

[2] Чалавек і свет. Мая Радзіма – Беларусь: Падручнік для 4-га класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовай навучання / С. В. Паноў [і інш.]. 2-е выд., дапоўненае і выпраўленае. Мінск, 2013. 151 с.

[3] Паноў С. В., Тарасаў С. В. Чалавек і свет. Мая Радзіма – Беларусь: Вучэб. дапаможнік для 4-га класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовай навучання. Мінск, 2018. 166 с.

ненне гарадоў, ВКЛ як беларуска-літоўская дзяржава, барацьба з іншаземнымі захопнікамі, пачаткі кнігапісання і кнігадрукавання, народнае і прафесійнае мастацтва, літаратура. Знакавымі асобамі ў гісторыі Беларусі выступаюць князь Рагвалод і Рагнеда, Усяслаў Чарадзей, Ефрасіння Полацкая і Кірыла Тураўскі, Вітаўт, Леў Сапега, Францыск Скарына, Сімяон Полацкі, Міхал Казімір і Міхал Клеафас Агінскія, Францішак Багушэвіч, Янка Купала і Якуб Колас.

Можна сказаць, што паводле адбору гістарычных фактаў і іх інтэрпрэтацыі падручнік выглядае цалкам беларусацэнтрычным. Але калі пачынаецца гаворка пра XX стагоддзе, гэтая беларусацэнтрычнасць набывае, так бы мовіць, "саветызаваны" выгляд. Так, у кнізе прыгадваецца Першая сусветная вайна, аднак нічога не сказана пра распад падчас яе Расійскай імперыі, барацьбу народаў за дзяржаўную самастойнасць, не даецца паняцця пра беларускі нацыянальны рух, не называюцца яго дзеячы. Ключавой падзеяй гэтага перыяду выступае Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г., пасля якой "рабочыя і сяляне пачалі будаваць новае жыццё". Факт абвяшчэння ў 1918 г. Беларускай Народнай Рэспублікі абмінаецца маўчаннем. Затое стварэнне ў 1919 г. Беларускай ССР падкрэслена акцэнтуецца. Прычым у версіі падручніка, які выкарыстоўваўся да 2018 г., інфармацыя пра БССР суправаджалася наступным каментаром: "Гэтая незалежная дзяржава паклала пачатак самастойнаму жыццю беларускага народа"[4]. У цяперашнім выданні эпітэт "незалежная" ў працытаваным сказе апушчаны, але ўсе роўна менавіта БССР выступае першай формай дзяржаўнай самастойнасці беларусаў.

Відавочны крэн у бок "савецкасці" выяўляецца і ў тым, што жыццю ў міжваенныя гады ў БССР прысвечаны цэлы параграф, а пра заходнюю палову беларускіх зямель у складзе Польскай дзяржавы распавядаецца толькі ў кароткім дадатку да гэтага параграфа пад рубрыкай "карысна ведаць". Спосаб падачы матэрыялу пра дзве часткі Беларусі, яго танальнасць таксама адрозніваюцца.

Хоць аўтары і пазбягаюць колішняй афіцыезнай пафаснасці пры апісанні жыцця ў Савецкім Саюзе, яно пад іх пяром выглядае калі не ідылічным, то зусім нармальным, усяляе аптымізм. А вось звесткі пра становішча ў Заходняй Беларусі афарбаваны цалкам негатыўнымі

---

4 Чалавек і свет. Мая Радзіма – Беларусь: Падручнік для 4-га класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовай навучання / С. В. Паноў [і інш.]. 2-е выд., дапоўненае і выпраўленае. Мінск, 2013. С. 96.

канатацыямі[5]. Фактычна ўсе савецкае разглядаецца як "свае", а ўсе несавецкае – як "чужое".

Увогуле трэба заўважыць, што падзеі Першай сусветнай вайны, яе наступствы для Беларусі ў падручніку для 4-га класа не вылучаны ў асобны сюжэт, прыгадваюцца мімаходзь, што асабліва кантрасна выглядае на фоне вялікага (па мерках гэтага падручніка) тэксту пра Вялікую Айчынную вайну (тэрмін "Другая сусветная вайна" не ўжываецца).

Сістэматызаванае вывучэнне гісторыі як асобнай дысцыпліны ажыццяўляецца беларускімі школьнікамі ў 5–11 класах. У 5-м класе выкладаецца гісторыя Старажытнага свету, пачынаючы з 6-га – сінхронна вывучаюцца сусветная гісторыя (Сярэднія вякі, Новы і Навейшы час) і гісторыя Беларусі. Да тэматыкі Першай сусветнай вайны чарга даходзіць у 9-м класе, калі школьнікі вывучаюць сусветную гісторыю Новага часу (другую яго частку: XIX – пачатак XX ст.) і гісторыю Беларусі таго ж перыяду (канец XVIII – пачатак XX ст.). Пры гэтым у курсе сусветнай гісторыі Новага часу вайна вывучаецца поўнасцю, ад пачатку да канца (з 1914 да 1918 гг.), а эпоха Навейшай гісторыі (у 10-м класе) адкрываецца рашэннямі Версальскай мірнай канферэнцыі. А вось у курсе гісторыі Беларусі цэласны феномен Першай сусветнай вайны разбіваецца на два кавалкі: падзеі да кастрычніка 1917 г. ўключаюцца ў перыяд канца XVIII – пачатку XX ст. і разглядаюцца ў 9–м класе, а Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. і пачатыя ею працэсы аднесены да наступнага перыяду айчыннай гісторыі (1917–1945 гг.) і вывучаюцца школьнікамі ў 10-м класе. Такім чынам, для сусветнай гісторыі ролю цэзуры паміж Новым і Навейшым часам выконвае 1918 год (год заканчэння Першай сусветнай вайны), а для айчыннай – 1917 год (прыход у Расіі да ўлады бальшавікоў).

Другі этап Новай гісторыі (XIX – пачатак XX ст.) беларускія дзевяцікласнікі вывучаюць паводле навучальнага дапаможніка прафесара У. С. Кошалева "Сусветная гісторыя Новага часу, XIX – пачатак XX ст."[6] Апошні яго параграф характарызуе крызісныя працэсы ў эканоміцы і грамадска-палітычным жыцці дзяржаў – удзельніц Першай сусветнай вайны, асвятляе ход ваенных дзеянняў у 1917–1918 гг. Адзначаецца,

---

5 Паноў С. В., Тарасаў С. В. Чалавек і свет. Мая Радзіма – Беларусь: Вучэб. дапаможнік для 4-га класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовай навучання. Мінск, 2018. С. 103.

6 Кошалеў У. С. Сусветная гісторыя Новага часу, XIX – пачатак XX ст.: Вучэбны дапаможнік для 9-га класа агульнаадукац. устаноў. 3-е выд., дап. і перагледж. Мінск, 2010. 231 с.

што найбольшай вастрыні крызіс дасягнуў у Расіі, вынікам чаго стала зрынанне самадзяржаўя ў лютым і захоп улады бальшавікамі ў кастрычніку 1917 г. Бальшавіцкі ўрад, – падкрэслівае аўтар, – фактычна капітуляваў, заключыўшы 3 сакавіка 1918 г. у Брэст-Літоўску сепаратны мір з Германіяй і яе саюзнікамі. Гэта, аднак, не выратавала Германію ад паражэння. Недахоп сіл і людскіх рэсурсаў, эканамічная разруха, падзенне кайзераўскай манархіі ў лістападзе 1918 г. вымусілі Германію капітуляваць. Сярод вынікаў Першай сусветнай вайны згадваецца распад Асманскай і Аўстра-Венгерскай імперый, абвяшчэнне Аўстрыі і Германіі рэспублікамі, рэвалюцыйная трансфармацыя палітычнай сістэмы ў Расіі (аднак сутнасць бальшавіцкага рэжыму не раскрываецца). Пералічаны новыя незалежныя дзяржавы, утвораныя ў выніку вайны: Польшча, Чэхаславакія, Югаславія, Венгрыя, Латвія, Літва, Эстонія і Фінляндыя. Зроблена спроба адлюстраваць культурныя і інтэлектуальныя наступствы Першай сусветнай вайны: адзначаецца, што яна пахіснула веру чалавека ў будучае, у невычарпальны патэнцыял навукова-тэхнічнага прагрэсу. Пры гэтым аўтар не ўпускае магчымасці ў адпаведнасці з афіцыйным ідэалагічным трэндам пасеяць у свядомасці вучняў антызаходніцкія настроі: маўляў, "вайна бязлітасна выявіла адмоўныя бакі еўрапейскай цывілізацыі – яе абыякавасць да чалавека і імкненне вырашаць грамадскія праблемы пры дапамозе насілля"[7]. Доказаў, што іншыя цывілізацыі былі больш спагадлівымі да чалавека і менш схільнымі да гвалту, у кнізе не прыводзіцца[8].

Разгляд тэмы Першай сусветнай вайны завяршаецца ў дапаможніку У. С. Кошалева наступным падсумаваннем: "Вайна не вырашыла ўсіх супярэчнасцей паміж вялікімі дзяржавамі, што прывяло чалавецтва да Другой сусветнай вайны"[9].

---

[7] Кошалеў У. С. Сусветная гісторыя Новага часу, XIX – пачатак XX ст.: Вучэбны дапаможнік для 9-га класа агульнаадукац. устаноў. 3-е выд., дап. і перагледж. Мінск, 2010. С. 216.

[8] На "круглым стале", прысвечаным праблемам гістарычнай навукі і гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, які адбыўся 22 верасня 2006 г. ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі, прафесар У. С. Кошалеў як перавагу беларускіх падручнікаў у параўнанні з школьнай навучальнай літаратурай іншых постсавецкіх дзяржаў адзначаў тое, што ў іх значнае месца (да 20%) адводзіцца гісторыі Расіі, і асвятляецца яна "аб'ектыўна, з павагай да сяброўскага нам народа", у той час як у іншых краінах, паводле слоў прафесара, "створаны негатыўны вобраз Расіі, якая быццам бы і цяпер схільная да імперскіх амбіцый". (Беларускі гістарычны часопіс. 2007. № 1. С. 13).

[9] Кошалеў У. С. Сусветная гісторыя Новага часу, XIX – пачатак XX ст.: Вучэбны дапаможнік для 9-га класа агульнаадукац. устаноў. 3-е выд., дап. і перагледж. Мінск, 2010. С. 211.

Гэты тэзіс на канкрэтным гістарычным матэрыяле раскрываецца ў навучальным дапаможніку для 10-га класа "Сусветная гісторыя Навейшага часу, 1918–1945 гг." аўтарства прафесароў Г. А. Космача і У. С. Кошалева і кандыдата педагагічных навук М. А. Красновай[10]. Пры характарыстыцы Версальска-Вашынгтонскай сістэмы міжнародных адносін падкрэсліваюцца яе супярэчнасці і недахопы, найперш – "несправядлівае пераўладкаванне пасляваеннага свету і рабаўніцкія, цяжкія ўмовы мірных дагавораў для пераможаных краін". Як вынік, канстатуецца, што Версальскі мір утрымліваў зародак новых войнаў і канфліктаў[11].

У дапаможніку ёсць асобны раздзел "Гісторыя Савецкай дзяржавы: 1917–1939 гг." У ім асвятляюцца рэвалюцыйныя ўзрушэнні ў Расіі ад лютага да кастрычніка 1917 г., узброены захоп улады бальшавікамі (пры гэтым адзначаецца, што Ленін адхіліў ідэю мірнага прыходу да ўлады праз Устаноўчы сход), пералічваюцца першыя прававыя акты і практычныя крокі бальшавіцкага ўрада. Адмоўна ацэньваецца падпісанне бальшавікамі сепаратнага Брэсцкага міру 1918 г., што справакавала інтэрвенцыю краін Антанты ў Расію. Прасочваюцца ваенныя дзеянні на франтах Грамадзянскай вайны, на гэтым фоне характарызуюцца асноўныя праявы ўстаноўленага бальшавікамі палітычнага рэжыму: "чырвоны тэрор", палітыка "ваеннага камунізму", аднапартыйная сістэма, манаполія марксізму ў сферы ідэалогіі і маралі. Пасля такой характарыстыкі нечаканым выглядае сцвярджэнне, не падмацаванае канкрэтнымі фактамі, што палітыку бальшавікоў "падтрымалі рабочыя і шматмільенная маса найбяднейшых сялян", чым нібыта і была забяспечана перамога "чырвоных" у Грамадзянскай вайне. Праўда, адначасова прызнаюцца панесеныя ў гэты перыяд "незаменныя духоўныя і маральныя страты", якія мелі "глыбокія сацыяльныя і культурныя наступствы для будучай гісторыі савецкай краіны"[12].

Разгорнуты выклад падзей 1917–1921 гг. у Беларусі ў кантэксце Першай сусветнай вайны і рэвалюцыйнага працэсу ў Расіі зроблены ў навучальным дапаможніку для 10-га класа "Гісторыя Беларусі, 1917–

10 Космач Г. А., Кошалеў У. С., Краснова М. А. Сусветная гісторыя Навейшага часу, 1918–1945 гг.: Вучэбны дапаможнік для 10-га класа устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Мінск, 2012. 214 с.

11 Космач Г. А., Кошалеў У. С., Краснова М. А. Сусветная гісторыя Навейшага часу, 1918–1945 гг.: Вучэбны дапаможнік для 10-га класа устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Мінск, 2012. С. 13.

12 Космач Г. А., Кошалеў У. С., Краснова М. А. Сусветная гісторыя Навейшага часу, 1918–1945 гг.: Вучэбны дапаможнік для 10-га класа устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Мінск, 2012. С. 80.

1945 гг.", аўтарам якога з'яўляецца прафесар Я. К. Новік[13]. Шматразова прадэкляраваная і амаль нязменная адданасць гэтага навукоўца савецкай ідэалагічнай дактрыне выразна дае аб сабе знаць і ў тэксце названага дапаможніка. Хоць разам з тым заўважаюцца спробы адаптаваць уяўленні і стэрэатыпы савецкага часу да сенняшніх рэалій, акцэнтаваннем увагі на працэсах утварэння беларускай дзяржаўнасці сфармаваць у навучэнцаў лаяльнасць да сучаснай Рэспублікі Беларусь і яе ўладаў.

Асвятляючы партыйна-палітычную барацьбу ў 1917 г., аўтар не ўтойвае сваіх сімпатый да бальшавіцкай партыі, толькі гэтую партыю і яе прыхільнікаў трактуе як рэвалюцыйную сілу, а ўсіх яе палітычных апанентаў (у т. л. сацыялістаў небальшавіцкага толку) запісвае ў лагер контррэвалюцыі. Захоп улады бальшавікамі падаецца як цалкам заканамерны і непазбежны, ніякія альтэрнатывы не разглядаюцца. Нягледзячы на абмежаванасць школьнага дапаможніка ў аб'еме і насуперак метадычным прынцыпам, прафесар Новік нават у такім выданні знаходзіць месца, каб выказаць асабістае шкадаванне з той нагоды, што ў сучаснай літаратуры Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. больш не ацэньваецца як "вялікая" і "сацыялістычная"[14].

У расповедзе пра германскі наступ у лютым 1918 г. дапаможнік паўтарае савецкі міф аб тым, нібыта 23 лютага пад Нарвай і Псковам толькі што арганізаваныя атрады Чырвонай арміі прыпынілі "адборныя, добра ўзброеныя фарміраванні германскіх войскаў". Такім спосабам у вачах школьнікаў легітымізуецца святкаванне ў Рэспубліцы Беларусь 23 лютага як Дня абаронцаў Айчыны. Але якая "Айчына" пры гэтым маецца на ўвазе, у кнізе не патлумачана.

Затое пераказ зместу Брэсцкага мірнага дагавора зроблены ўжо не так з агульнасавецкіх, як з прабеларускіх пазіцый: падрабязна адлюстраваны падзел тэрыторыі Беларусі на некалькі частак; адзначаецца, што па волі Расіі і Германіі беларускаму насельніцтву не былі кампенсаваныя страты, прычыненыя вайной; урэшце канстатуецца, што ніводным з удзельнікаў перагаворнага працэсу ў Брэсце інтарэсы Беларусі не ўлічваліся.

Прэваліруючай тэмай пры асвятленні ў дапаможніку разгляданага перыяду гісторыі выступае працэс утварэння беларускай дзяржаўнасці

---

13 Новік Я. К. Гісторыя Беларусі, 1917–1945 гг.: Вучэбны дапаможнік для 10-га класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Мінск, 2012. 182 с.

14 Новік Я. К. Гісторыя Беларусі, 1917–1945 гг.: Вучэбны дапаможнік для 10-га класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Мінск, 2012. С. 12.

– пачынаючы ад Усебеларускага з’езда 1917 г. і заканчваючы паўторным абвяшчэннем у 1920 г. Беларускай ССР.

Што датычыць Усебеларускага з’езда, то звесткі пра яго ў навучальнай кнізе – надзвычай лапідарныя і аднабокія. Нічога не сказана пра сялянскае паходжанне большасці дэлегатаў, іх пераважна левыя, сацыялістычныя погляды, не згадваюцца разгледжаныя з’ездам пытанні і прынятыя па іх рашэнні. Замоўчванне такіх фактаў, відавочна, спатрэбілася для таго, каб кантрабандай працягнуць у сучасны падручнік бальшавіцкія інсінуацыі 100-гадовай даўніны пра “контррэвалюцыйнасць” з’езда, яго ўяўны намер усталяваць у краі “буржуазную ўладу”. А гэта, на думку аўтара, нібыта з’яўлялася дастатковай падставай для ўзброенага разгону беларускага форуму бальшавікамі – што прафесар Новік следам за савецкай гістарыяграфіяй (але ў супярэчнасці з большасцю сучасных даследаванняў) заўзята апраўдвае. Адначасова шляхам прэпарыравання вядомага выказвання У. І. Леніна – “Усялякая рэвалюцыя толькі тады чаго небудзь вартая, калі яна ўмее абараняцца”[15] – беларускім школьнікам падспудна ўнушаецца антыдэмакратычны імператыў ахавальніцкай скіраванасці, што “кожная ўлада павінна ўмець сябе абараняць” (як вынікае з кантэксту – любымі сродкамі), а таксама бяздоказна сцвярджаецца, што ў сітуацыі канца 1917 года “не было іншага выбару ў барацьбе за ўладу, акрамя канфрантацыі”[16].

Пасля такой негатывісцкай уверцюры да тэмы ўзнікнення беларускай дзяржаўнасці як усцешны сюрпрыз успрымаецца адносна ўзважаная падача ў дапаможніку сюжэта пра абвяшчэнне ў 1918 г. Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР). У даволі нейтральным ключы прасочваецца ўтварэнне яе кіраўнічых структур, коратка перададзены змест трох Устаўных грамат. У дакументальным дадатку друкуецца фрагмент 2-й Устаўной граматы Выканаўчага камітэту Рады Усебеларускага з’езда – нягледзячы на тое, што з гэтым дакументам кепска стасуюцца папярэднія аўтарскія ацэнкі з’езда як “буржуазнай” ды “контррэвалюцыйнай” з’явы. І ўжо зусім сенсацыйным можна лічыць змяшчэнне ў навучальным дапаможніку, ухваленым Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, рэпрадукцый паштовак з выявамі бел-чырвона-белага сцяга і герба “Пагоня”, а таксама вядомага фотаздымка першага складу

---

15 Ленин В. И. Доклад: Объединенное заседание ВЦИК, Московского Совета, фабрично-заводских комитетов и профессиональных союзов, 2 октября 1918 г. // Ленин В. И. Полн. собр. соч., т. 37, с. 122.

16 Новік Я. К. Гісторыя Беларусі, 1917–1945 гг.: Вучэбны дапаможнік для 10-га класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Мінск, 2012. С. 23, 24.

Народнага сакратарыяту Беларусі. На ўключанай у кнігу карце "Беларусь ва ўмовах германскай акупацыі і Брэсцкага міру" месца абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі (Мінск) таксама пазначана бел-чырвона-белым сцяжком. Агульная ацэнка БНР зводзіцца да таго, што гэта была спроба стварэння беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці "на буржуазнай аснове" (гіпноз класавага падыходу непераадольны), якая ва ўмовах германскай акупацыі Беларусі не прывяла да ўсталявання паўнавартаснай дзяржавы[17].

У процівагу БНР утварэнне Беларускай ССР характарызуецца як пачатак "рэальнага і дзейснага нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў Беларусі". Пры гэтым не абмінаецца ўвагай супрацьдзеянне дадзенаму працэсу з боку Аблвыкамзаха і Паўночна-Заходняй абласной арганізацыі РКП(б), кіраўнікі якіх не прызнавалі існавання беларускай нацыі і імкнуліся да поўнага зліцця беларусаў з вялікарусамі. Нацыянальны нігілізм А. Мяснікова, В. Кнорына і іх паплечнікаў ацэньваецца як памылковая пазіцыя. Сярод прычын, чаму савецкае кіраўніцтва пайшло ўрэшце рэшт на абвяшчэнне БССР, называецца імкненне беларускага народа да ўтварэння сваей дзяржаўнасці, адпаведныя патрабаванні некаторых палітычных партый і арганізацый, намеры бальшавікоў з дапамогай гэтага кроку прыблізіць сусветную рэвалюцыю, таксама не скідваецца з рахунку і фактар існавання "самаабвешчанай" БНР[18]. З другога боку, разгляд серыі афіцыйных рашэнняў канца 1918 года, якімі было аформлена ўтварэнне БССР і КП(б)Б, не дапаўняецца ў школьным дапаможніку Я. К. Новіка (зрэшты, як і ў многіх навукова-даследчых публікацыях на гэту тэму) паказам таго, што ўяўляла сабой сістэма органаў улады і кіравання ў навастворанай савецкай рэспубліцы, якімі рэальнымі паўнамоцтвамі валодалі яе дзяржаўныя інстытуты і наколькі самастойнымі яны былі пры выкананні сваіх функцый.

Аб'яднанне неўзабаве Літоўскай і Беларускай савецкіх рэспублік у Літоўска-Беларускую ССР тлумачыцца ў дапаможніку "пагрозай інтэрвенцыі з боку Польшчы". Пры гэтым для апраўдання валюнтарысцкага рашэння ЦК РКП(б) аб адрыве ад Беларусі Віцебскай, Магілеўскай і Смаленскай губерняў выкарыстоўваецца не падмацаваная дакументамі гіпотэза некаторых даследчыкаў, быццам названыя губерні меркавалася

17 Новік Я. К. Гісторыя Беларусі, 1917–1945 гг.: Вучэбны дапаможнік для 10-га класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Мінск, 2012. С. 25.

18 Новік Я. К. Гісторыя Беларусі, 1917–1945 гг.: Вучэбны дапаможнік для 10-га класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Мінск, 2012. С. 26.

зрабіць асновай для аднаўлення беларускай дзяржаўнасці ў выпадку, калі іншыя тэрыторыі Беларусі будуць захоплены Польшчай.

Адраджэнне ў лістападзе 1918 г. Польскай дзяржавы падаецца як вынік паражэння Германіі і Аўстра-Венгрыі ў Першай сусветнай вайне і прызнання Савецкай Расіяй несапраўднымі ўсіх дагавораў царскага ўрада наконт лесу трэціх краін. Наступленне Войска Польскага на тэрыторыі Беларусі вытлумачваецца толькі жаданнем кіраўніцтва Польшчы аднавіць Рэч Паспалітую ў межах 1772 г., але не згадваецца пра аб'ектыўную неабходнасць для маладой Польскай дзяржавы адсунуць Расію далей на ўсход, каб зменшыць пагрозу з боку апошняй[19]. Пры апісанні акупацыйнага рэжыму на занятых палякамі землях увага акцэнтуецца на рэстаўрацыі панавання памешчыкаў і капіталістаў, тэроры, раскраданні матэрыяльных рэсурсаў і ганеннях на беларускую культуру. У такім кантэксце арыентацыя часткі беларускіх палітыкаў на супрацоўніцтва з Польшчай выглядае недальнабачнай і супярэчнай інтарэсам народа.

Але, вядома ж, "беларускі народ не скарыўся акупантам". Пры гэтым кіраўнікамі народнага супраціву прызнаюцца не толькі камуністы, але і беларускія эсэры, што з'яўляецца пэўным адыходам ад савецкіх шаблонаў. Вучням паведамляюцца факты аб супрацоўніцтве камуністаў і эсэраў дзеля стварэння адзінага антыпольскага фронту, асобна падкрэсліваецца роля ў гэтым Беларускай камуністычнай арганізацыі на чале з У. Ігнатоўскім.

Разыходжанні ў беларускім грамадстве наконт адносін да польскіх уладаў азнаменаваліся і расколам у кіраўнічых структурах БНР. Распавеўшы пра арганізацыйнае размежаванне на сесіі Рады БНР у снежні 1919 г. паміж прыхільнікамі і праціўнікамі супрацоўніцтва з Польшчай, аўтар паведамляе аб рэпрэсіях з боку акупацыйнай адміністрацыі супраць антыпольскага ўрада В. Ластоўскага і яго аднадумцаў, а Найвышэйшую раду БНР, што засталася на пазіцыях беларуска-польскага ўзаемадзеяння, з відавочнай нацяжкай называе "марыянеткай у польскай акупацыйнай адміністрацыі"[20].

---

[19] Лазько Р. Р. Парадоксы сучаснай беларускай гістарычнай палітыкі ў адлюстраванні падручнікаў па гісторыі для сярэдняй школы // Спрэчныя пытанні. = Sprawy trudne. З гісторыі польска-беларускіх узаемаадносін у 1918–1945 гг. Генезіс, кантэкст, вынікі. Зборнік навуковых прац II і IV міжнародных навукова-тэарэтычных канферэнцый (Мінск, 2010–2012 гг.). Мінск, 2013. С. 239.

[20] Новік Я. К. Гісторыя Беларусі, 1917–1945 гг.: Вучэбны дапаможнік для 10-га класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Мінск, 2012. С. 34.

Больш-менш аб'ектыўным выглядае адлюстраванне ў дапаможніку ваенных дзеянняў на польска-савецкім фронце ў 1920 г. Прызнаецца, што падчас ліпеньска-жнівеньскага наступлення Чырвонай арміі савецкім кіраўніцтвам "валодала ідэя сусветнай пралетарскай рэвалюцыі", а перанясенне баявых дзеянняў на польскую тэрыторыю (на захад ад "лініі Керзана") характарызуецца як "сур'езная палітычная памылка". Паражэнне Чырвонай арміі на Вісле і наступнае паспяховае контрнаступленне Войска Польскага вытлумачваецца найперш ваеннай і дыпламатычнай падтрымкай Польшчы з боку Антанты, але не адмаўляецца і "магутны нацыянальна-патрыятычны ўздым польскага народа ў абарону сваей радзімы"[21].

Ва ўвязцы з аперацыямі Чырвонай арміі на тэрыторыі Беларусі лаканічна распавядаецца пра другое абвяшчэнне ў канцы ліпеня 1920 г. Беларускай ССР. Аднак пытанне аб рэальным аб'еме суверэнітэту гэтай намінальна "незалежнай" рэспублікі зноў абмінаецца, таксама нічога не паведамляецца пра рознагалоссі паміж камуністамі і беларускімі эсэрамі адносна палітыка-прававых прынцыпаў функцыянавання беларускай дзяржавы і яе міжнароднага статусу.

Вельмі кароткую інфармацыю падае дапаможнік пра Рыжскі мірны дагавор і яго наступствы для Беларусі. Падкрэсліваецца, што на мірныя перамовы не былі дапушчаны ні прадстаўнікі БССР, ні прадстаўнікі БНР. У якасці падсумавання канстатуецца, што вынікам сацыяльна-палітычных узрушэнняў 1917–1921 гг. стаў падзел беларускай тэрыторыі на тры часткі – заходняя частка апынулася ў складзе Польскай дзяржавы, усходняя – у складзе РСФСР, і толькі шэсць паветаў Цэнтральнай Беларусі склалі тэрыторыю Беларускай Савецкай Рэспублікі. Ваенныя дзеянні і сацыяльна-палітычныя канфлікты, – адзначаецца ў падручніку, – зацягнулі Беларусь у глыбокі эканамічны і палітычны крызіс.

Беглы агляд зместу беларускіх школьных падручнікаў па гісторыі ў частцы адлюстравання ў іх падзей і наступстваў Першай сусветнай вайны дазваляе казаць пра іх пэўную супярэчлівасць, непаслядоўнасць, адсутнасць цэласнага канцэптуальнага асэнсавання адпаведных гістарычных працэсаў. З аднаго боку, відавочнае імкненне пагледзець на падзеі мінулага скрозь прызму гістарычнай суб'ектнасці Беларусі, з пазіцый беларускіх нацыянальных інтарэсаў, выкарыстаць расповяды пра зараджэнне беларускай дзяржаўнасці ў пачатку XX ст. для легітымізацыі

21 Новік Я. К. Гісторыя Беларусі, 1917–1945 гг.: Вучэбны дапаможнік для 10-га класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Мінск, 2012. С. 38–39.

сучаснай Рэспублікі Беларусь. З другога боку, школьны гістарычны наратыў нярэдка выяўляе блізкасць да савецкай кансерватыўнай традыцыі, утрымлівае прыкметныя элементы марксісцка-савецкай метадалогіі (класавы падыход). Фактычна школьная гістарычная адукацыя ў Беларусі ўсе яшчэ знаходзіцца ў стане пераходу ад палітычнай заангажаванасці да навуковай аб'ектыўнасці, ад савецкасці да беларускага незалежніцтва. Такое становішча – адна з праяў невыразнай, супярэчлівай, у чымсці парадаксальнай палітыкі памяці, якая праводзіцца ў Рэспубліцы Беларусь, на што ўжо звяртаў увагу прафесар Р. Р. Лазько[22].

У гэтай сітуацыі асаблівая адказнасць за фарміраванне гістарычнага светапогляду і грамадзянскіх якасцяў школьнікаў падае на плечы настаўніка. Як слушна адзначае Р. Р. Лазько, менавіта настаўнік, выкладчык есць і застанецца галоўным суб'ектам працэса фарміравання ведаў па гісторыі і неабходных арыенціраў дзейнасці, якія на гэтыя веды абапіраюцца[23]. Але наколькі беларускія настаўнікі паводле сваіх прафесійных і маральных характарыстык гатовыя да выканання такой місіі? Пакінем гэтае пытанне адкрытым.

## Бібліяграфія

Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь (Матэрыялы "круглага стала", які адбыўся 22 верасня 2006 г. у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі) // Беларускі гістарычны часопіс. 2006. № 10. С. 3–18; № 11. С. 3–18; № 12. С. 3–22; 2007. № 1. С. 3–23.

Корзюк А. А. Принципы построения содержания исторического образования в средней школе: общая характеристика и опыт реализации (1934–2008 гг.) // Методология и стратегии развития современного образования. Мат-лы Междунар. науч. конф-ции, посвященной 85-летию Национального института образования (Минск, 11 декабря 2014 г.). Минск, 2015. С. 515–524.

22 Лазько Р. Р. Парадоксы сучаснай беларускай гістарычнай палітыкі ў адлюстраванні падручнікаў па гісторыі для сярэдняй школы // Спрэчныя пытанні. = Sprawy trudne. З гісторыі польска-беларускіх узаемаадносін у 1918–1945 гг. Генезіс, кантэкст, вынікі. Зборнік навуковых прац ІІ і IV міжнародных навукова-тэарэтычных канферэнцый (Мінск, 2010–1012 гг.). Мінск, 2013. С. 234, 240.

23 Лазько Р. Р. Насуперак праўдзе і дзяржаўным інтарэсам (аб інтэрпрэтацыі гісторыі беларускай дзяржаўнасці 1917–1920 гг. у адным дапаможніку для сярэдняй школы) // Известия Гомельского государственного университета. 2013. № 4 (79). Гуманитарные науки. С. 67.

Космач Г. А., Кошалеў У. С., Краснова М. А. Сусветная гісторыя Навейшага часу, 1918–1945 гг.: Вучэбны дапаможнік для 10-га класа устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Мінск, 2012. 214 с.

Кошалеў У. С. Сусветная гісторыя Новага часу, XIX – пачатак XX ст.: Вучэбны дапаможнік для 9-га класа агульнаадукац. устаноў. 3-е выд., дап. і перагледж. Мінск, 2010. 231 с.

Лазько Р. Р. Насуперак праўдзе і дзяржаўным інтарэсам (аб інтэрпрэтацыі гісторыі беларускай дзяржаўнасці 1917–1920 гг. у адным дапаможніку для сярэдняй школы) // Известия Гомельского государственного университета. 2013. № 4 (79). Гуманитарные науки. С. 66–71.

Лазько Р. Р. Парадоксы сучаснай беларускай гістарычнай палітыкі ў адлюстраванні падручнікаў па гісторыі для сярэдняй школы // Спрэчныя пытанні. = Sprawy trudne. З гісторыі польска-беларускіх узаемаадносін у 1918–1945 гг. Генезіс, кантэкст, вынікі. Зборнік навуковых прац II і IV міжнародных навукова-тэарэтычных канферэнцый (Мінск, 2010–1012 гг.). Мінск, 2013. С. 233–241.

Новік Я. К. Гісторыя Беларусі, 1917–1945 гг.: Вучэбны дапаможнік для 10-га класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Мінск, 2012. 182 с.

Паноў С. В. Гістарычная адукацыя ў Беларусі: вопыт рэфармавання і перспектывы ўдасканалення // Методология исследований истории Беларуси: проблемы, достижения, перспективы. Мат-лы Междунар. науч. конф-ции (Минск, 22–23 октября 2008 г.). Минск, 2009. С. 171–174.

Паноў С. В., Тарасаў С. В. Чалавек і свет. Мая Радзіма – Беларусь: Вучэб. дапаможнік для 4-га класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовай навучання. Мінск, 2018. 166 с.

Чалавек і свет. Мая Радзіма – Беларусь: Падручнік для 4-га класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовай навучання / С. В. Паноў [і інш.]. 2-е выд., дапоўненае і выпраўленае. Мінск, 2013. 151 с.

## Streszczenie

Artykuł stanowi analizę prezentacji wydarzeń 1918 r., ich przyczyn i następstw, w podręcznikach szkolnych do historii w Republice Białoruś. Przedmiotem opisu są teksty podręczników: do klasy IV – *Człowiek i świat. Moja Ojczyzna – Białoruś* (autorzy: S. W. Panau i S. W. Tarasau); do IX klasy – *Historia powszechna nowych czasów, XIX – początek XX w.* (U. S. Koszaleu); do X klasy – *Historia powszechna najnowszych czasów 1918–1945* (G. A. Kosmacz, U. S. Koszaleu, M. A. Krasnowa) oraz *Historia Białorusi 1917–1945* (J. K. Nowik). Wynikiem przeprowadzonych badań są wnioski o sprzecznościach i niekonsekwencjach prezentacji procesów historycznych w szkolnych podręcznikach białoruskich. Z jednej strony zauważa się dążenie do pokazania minionych wydarzeń przez pryzmat historycznej podmiotowości Białorusi, wykorzystania historycznej narracji do legitymizacji współczesnej białoruskiej państwowości, z drugiej zaś widoczne jest przywiązanie do sowieckiej konserwatywnej tradycji. Zauważalne są elementy mark-

sistowsko-sowieckiej metodologii. Taką sytuację można tłumaczyć niezbyt jasną i pełną sprzeczności polityką pamięci, jaka jest realizowana w Republice Białoruś.

**Рэзюмэ**

У артыкуле аналізуецца асвятленне падзей 1918 года, іх перадумоў і наступстваў у школьных падручніках па гісторыі ў Рэспубліцы Беларусь. Прадметам разгляду з'яўляюцца тэксты навучальных дапаможнікаў: для 4-га класа – "Чалавек і свет. Мая Радзіма – Беларусь" (аўтары С. В. Паноў і С. В. Тарасаў), для 9-га класа – "Сусветная гісторыя Новага часу, XIX – пачатак XX ст." (У. С. Кошалеў), для 10-га класа – "Сусветная гісторыя Навейшага часу, 1918–1945 гг." (Г. А. Космач, У. С. Кошалеў, М. А. Краснова) і "Гісторыя Беларусі, 1917–1945 гг." (Я. К. Новік). Зроблена выснова пра супярэчлівасць, непаслядоўнасць асвятлення ў беларускіх школьных падручніках адпаведных гістарычных працэсаў: з аднаго боку, назіраецца імкненне паказаць падзеі мінулага скрозь прызму гістарычнай суб'ектнасці Беларусі, выкарыстаць школьны гістарычны наратыў для легітымізацыі сучаснай беларускай дзяржаўнасці, з другога – відавочная прыхільнасць да савецкай кансерватыўнай традыцыі, прыкметныя элементы марксісцка-савецкай метадалогіі. Такая сітуацыя вытлумачваецца невыразнасцю, супярэчлівасцю палітыкі памяці, якая праводзіцца ў Рэспубліцы Беларусь.

**Summary**

The article is an analysis of the way the events of the year 1918, their causes and consequences are presented in the history textbooks in the Republic of Belarus. The object of study are the texts in the textbooks for the fourth grade – *Humans and the World. My Fatherland – Belarus* (authors: S. W. Panau and S. W. Tarasau); for the ninth grade – *General History of Modern Times, 19th – beginning of the 20th centuries* (U. S. Koszaleu); for the tenth grade – *General History of Contemporary Times 1918–1945* (G. A. Kosmacz, U. S. Koszaleu, M. A. Krasnowa) and *History of Belarus 1917–1945* (J. K. Nowik). The outcome of the conducted study are the conclusions about discrepancies and a lack of consequence in presenting historical processes in Belarusian textbooks. On the one hand, what is noticeable is the aspiration to show the past events through the prism of historical recognition of Belarus and to use the historical narrative to legitimize the contemporary Belarusian state, and on the other, the attachment to the Soviet conservative tradition is observed. Also, the elements of Soviet-Marxist methodology are noticeable. Such a situation may be explained by an ambiguous and discrepant politics of the memory pursued in the Republic of Belarus.

**Stanisłau Rudowicz** – pracuje w Białoruskim Instytucie Dokumentacji i Archiwizacji w Mińsku

e-mail: rustas59@gmail.com